УДК 929.52«1941-1945»

Студ. К.С. Жучкевіч
Навук. кір. дац. В.М. Астрога
(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі, БДТУ)

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў ЛЁСЕ МАЁЙ СЯМ'І

Вайна… Слова, якое гучыць на ўсіх мовах свету аднолькава жудасна і агідна. Глыбінная сутнасць, безумоўна, не ў гучанні, а ва ўчынках і паводзінах людзей, іх адданасці роднай зямлі.

Набліжаецца 80-годдзе Вялікай Перамогі над фашысцкімі захопнікамі. І няма, напэўна, ніводнай сям'і ў Беларусі, чые дзяды і прадзеды, блізкія сваякі старэйшага пакалення не ўдзельнічалі б у набліжэнні гэтай Перамогі, змагаючыся на палях бітваў або ў тыле ворага. Многія з іх не вярнуліся з вайны. Але ўсе яны, хто здабыў Перамогу, і тыя, хто загінуў, так і не пабачыўшы яе, застаюцца для дзяцей і ўнукаў прыкладам патрыятызму, годным нашай памяці.

Мой прадзед Саўко Уладзімір Уладзіміравіч, якога, на жаль, ўжо сёння няма ў жывых, нарадзіўся 16 сакавіка 1921 г. ў вёсцы Браносава Карэліцкага раёна. У той час Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польшчы, з'яўляючыся яе  аграрна-сыравінным прыдаткам. Пачаўся нацыянальна-вызваленчы рух супраць прыгнёту польскіх паноў, у якім удзельнічалі шматлікія жыхары Карэліцкага раёна. Ячэйкі былі створаны ў вёсках Турэц, Обрына і Сіняўская Слабада. Пасля заканчэння школы прадзед стаў членам падполля, удзельнічаў у арганізацыі масовак, распаўсюджванні  лістовак.

Атрымаўшы спецыяльнасць краўца, Саўко У.У. паехаў у Ленінград, дзе ў верасні 1941 г. быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі радавым стралком. Ён стаў разведчыкам узвода пешай разведкі. 10 лютага 1942 г. у баях за Ноўгарад быў паранены пры выкананні баявога задання і прадстаўлены да ўзнагароды медалём "За баявыя заслугі". Пасля рэабілітацыі ў чэрвені 1943 г. быў накіраваны працягваць службу ў 177 Любанскую стралковую дывізію 483 стралковага палка. Падчас вайны прадзед быў узнагароджаны медалямі "За абарону Ленінграда", "За адвагу",  "За перамогу над Германіяй і Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў".

Пасля заканчэння вайны прадзед вярнуўся ў родную вёску, удзельнічаў у калектывізацыі, а з 1950 па 1962 г. узначальваў калгас імя І.Д. Чарняхоўскага. У працэсе сваёй працоўнай дзейнасці ён быў прадстаўлены да дзяржаўных узнагарод. Яго імя значыцца ў кнізе "Памяці" Карэліцкага раёна. Я ганаруся сваім прадзедам, які ўсю вайну абараняў Радзіму і ўнёс свой уклад у Вялікую Перамогу.